Created in Master PDF Editor - Demo Version

1-18

ISSN 2224-798X

# ГІСТОРЫЯ і грамадазнаўства

серыя «У дапамогу педагогу»

НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

№1 (79)/2018
Студзень

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

# ГІСТОРЫЯ і грамадазнаўства


## ТЭОРЫЯ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

3 **Ковяко И. И.** Германский вопрос в политике великих держав в 1945—1949 годах: англо-американская историография проблемы

## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

7 **Рышкевіч Л. М.** Старажытная Спарта. Сусветная гісторыя, V клас

12 **Гомолко Т. В.** Россия в период правления первых Романовых. Всемирная история, VII класс

17 **Малофей И. И.** Раннее Возрождение. Всемирная история, VI класс

22 **Павловская Т. А., Шепелевич И. И.** Война России с Речью Посполитой (1654—1667 годы). Интегрированный урок по математике и истории, VIII класс

28 **Речиц А. Н.** Использование логико-смысловых моделей для изучения истории в условиях допрофильной подготовки (V—IX классы)

38 **Демчук Т. В.** Культура США и стран Европы после Второй мировой войны. Всемирная история, XI класс

## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ФАКУЛЬТАТЫВАЎ

46 **Хацько Е. В.** Английская буржуазная революция XVII века в портретах Томаса Бабингтона Маколея. Всемирная история Нового времени XVI–XVIII веков, VIII класс

51 **Ляненка В. В.** Арганізацыя і ўзбраенне войска ВКЛ у XIII—XV стагоддзях. Гісторыя Беларусі, VI клас

## ПАЗАКЛАСНАЯ РАБОТА

56 **Заровская И. Е.** Урок мира в школьном музее, VIII класс

60 **Лиханова Н. А.** Солдат войну не выбирает. Сценарий

63 **Мороз А. В.** Использование историко-краеведческого компонента для формирования учебно-познавательных компетенций учащихся на уроках истории Беларуси

68 Диалог: редколлегия—учитель


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**На першай старонцы вокладкі** — Успенскі сабор у Віцебску (1715—1743 гг.). Узарваны ў 1937 г., адноўлены ў 2000—2010 гг. Фота wikipedia.

Дасылаючы матэрыялы для публікацыі ў нашым часопісе, аўтары тым самым перадаюць выдаўцу невыключныя маёмасныя правы на ўзнаўленне, распаўсюджванне, паведамленне для ўсеагульнага ведама і іншыя магчымыя спосабы выкарыстання твора без абмежавання тэрыторыі распаўсюджвання (у тым ліку ў электроннай версіі часопіса).

Рэдактар *Л. В. Саламаха*, карэктар *Л. М. Сцяпанава*, камп'ютарны набор і вёрстка *М. В. Данілевіч*.

Выхад у свет 29.01.2018.
Фармат 60 x 84 1/8. Друк афсетны. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 7,9. Ул.-выд. арк. 8,4.
Тыраж 659 экз. Заказ 5. Цана свабодная.

Адрас рэдакцыі часопіса
«Гісторыя і грамадазнаўства»:
вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск; тэл. 297-93-20.

Надрукавана ў друкарні Таварыства з абмежаванай адказнасцю «СУГАРТ».
ЛП № 02330/427 ад 17.12.2012.
Вул. Валгаградская, 6, корп. 2, каб. 287, 220012, г. Мінск.
© РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», 2018
© Вокладка. К. К. Шастоўскі, 2018

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



ные ассоциации, сформировали собственные позицию и точку зрения о качествах и жизненных принципах, необходимых для главы государства, о тяготах гражданской войны и революционных событий, продолжили развитие навыков самостоятельной поисковой работы с текстом, работы в группе. Кроме того, работа с хрестоматийным материалом способствует выработке у учащихся самостоятельных навыков научно-исследовательской деятельности, повышению уровня читательских умений и интереса к мировому историческому наследию. В образовательный процесс введены фрагменты исторического труда, который высоко ценится в мировой историографии, — «История Англии от восшествия Якова II на престол» Т. Б. Маколея.

**Список использованных источников**


1. Учебная программа факультативных занятий «Всемирная история Нового времени XVI—XVIII вв.: страны и люди» по учебному предмету «Всемирная история», VIII класс // Национальный образовательный портал [Электронный ресурс]. — 2017. — Режим доступа : http://www.adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2017-2018-uchebnyj-god/202-uchebnye-predmety-v-xi-klassy/1283-vsemirnaya-istoriya.html. — Дата доступа : 15.09.2017.
2. *Маколей, Т. Б.* История Англии. Часть I / Т. Б. Маколей // Полн. собр. соч.: в 15 т. — СПб. : Издание книгопродавца типографа М. О. Вольфа, 1866. — Т.6. — 384 с.
3. *Маколей, Т. Б.* Англия и Европа. Избранные эссе / Т. Б. Маколей. — СПб. : Алетейя, 2001. — 512 с.
4. *Боно, Э.* Шесть шляп мышления / Э. Боно // E-Libra Электронная библиотека [Электронный ресурс]. — 2010 — 2017. — Режим доступа : http://e-libra.ru/read/207841-shest-shlyap-myshleniya.html. — Дата доступа : 14.09.2017.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Арганізацыя і ўзбраенне войска ВКЛ у XIII—XV стагоддзях

## Гісторыя Беларусі, VI клас

**В. В. Ляненка,** настаўнік гісторыі спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы № 18 г. Мінска для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы

Сучасная школа адыгрывае важную ролю ў фарміраванні гістарычнага светапогляду асобы, спрыяе яе сацыялізацыі, станаўленню сацыяльна актыўнай пазіцыі як грамадзяніна і патрыёта. Важнае месца ў гэтым працэсе належыць уроку гісторыі, які з'яўляецца не толькі адукацыйным падмуркам, але і пляцоўкай, на якой закладваюцца ўяўленні аб ролі гістарычнага працэсу ў жыцці грамадства. У гэтай сувязі тэматыка дзяржаўнасці, яе інстытутаў, абгрунтавання яе незалежнасці набывае важнае значэнне ў працэсе навучання і выхавання будучых грамадзян.

Першыя гістарычныя ўяўленні аб дзяржаўнасці Беларусі, яе органаў улады вучні атрымліваюць у VI класе, калі пачынаюць вывучаць гісторыю сваёй краіны. Адным з важных пытанняў, якое забяспечвае ўяўленне школьнікаў аб існаванні дзяржаўнасці,



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



з'яўляецца праблема захавання незалежнасці дзяржавы, яе меж і небяспекі грамадзян. Так, аўтарамі падручніка «Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст.» у 2 частках прапануецца тэма «Войска і ваенная справа. Знешняя палітыка ВКЛ у другой палове XV ст.», якая ўтрымлівае фактычныя матэрыялы, прысвечаныя войску ВКЛ. **Мэтай** артыкула з'яўляецца навукова-метадычная інтэрпрэтацыя пытанняў арганізацыі і ўзбраення войска ВКЛ у XIII— XVстст.

Існаванне дзяржавы заўсёды забяспечвалася функцыянаваннем высокаарганізаванага войска, на ўладкаванне якога патрабавалася значнае фінансаванне. Для задавальнення адукацыйных патрэб школьнікаў перад настаўнікам стаіць задача інтэрпрэтацыі вайсковай службы і арганізацыі войска ВКЛ. Гэта метадычная пазіцыя прадугледжвае пастаноўку наступных пытанняў:

1. Чым была выклікана патрэба ў арганізацыі прафесійнага войска, і як яна ажыццяўлялася?

2. Чаму запрашалі наёмнікаў у прафесійнае войска?

3. Якое значэнне адыгрывала непрафесійнае войска ў жыцці ВКЛ?

4. Што ўяўляла сабою войска Вялікага Княства Літоўскага па сацыяльным складзе?

Пастаноўка гэтых пытанняў будзе садзейнічаць павышэнню пазнавальнага інтарэсу вучняў, абуджэнню іх цікавасці да мінулага і больш глыбокага засваення зместу гістарычнай адукацыі. Для іх раскрыцця настаўнік павінен улічваць узроставыя і індывідуальныя асаблівасці школьнікаў, узровень іх ведаў.

Навуковыя аспекты арганізацыі войска ВКЛ даследаваў буйны гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар Ю. М. Бохан. Вайсковай справе ВКЛ прысвечаны яго працы: «Узбраенне войска ВКЛ другой палоны XIV — канца XVI ст.»; «Зброя Вялікага Княства Літоўскага. 1385—1576»; «Наёмнае войска ў Вялікім Княстве Літоўскім. XV—XVI стст.»; «Вайсковая справа ў Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XIV — канцы XVI ст.». У гэтых даследаваннях утрымліваецца важная навуковая інфармацыя, якая датычыцца працэсу арганізацыі войска і яго родаў; груптоўна апісваюцца адзінкі ўзбраення, знешні выгляд вояраў і іх ваенныя абавязкі, арганізацыйныя адзінкі войска. Гісторык меў рацыю, калі сцвярджаў: «На сённяшні дзень мала хто, апроч абмежаванага кола вузкіх спецыялістаў, мае хоць якое-небудзь уяўленне пра ўзбраенне Вялікага Княства Літоўскага XIV—XVI стст.» [2, с. 3]. Канстатуючы гэту тэзу, неабходна падкрэсліць, што выкладанне тэмы мае некаторыя тэарэтычныя цяжкасці, выкліканыя тым, што яна не поўна раскрыта ў школьным падручніку. У гэтым артыкуле прапануюцца метадычныя рэкамендацыі для інтэрпрэтацыі праблем арганізацыі войска ВКЛ.

З школьнага падручніка вынікае, што ваенны паход з'яўляўся абавязкам кожнага грамадзяніна ВКЛ, які быў здольны трымаць зброю, але гэта ажыццяўлялася за асабістыя сродкі.

З цягам часу пачала ўзрастаць патрэба ў арганізацыі прафесійнага войска, якое магло эфектыўна забяспечыць надзейную абарону меж дзяржавы, яе цэласнасць і незалежнасць. Для гэтага прадугледжвалася забеспячэнне войска высакаякасным узбраеннем. Тым самым знешняя небяспека маладой моцнай дзяржавы прадугледжвала неабходнасць фарміравання рэгулярнага, наёмнага, прафесійнага войска. У сваю чаргу, яго моц вызначалася перадавым узбраеннем.

На землях ВКЛ пачало фарміравацца *«паспалітае рушэнне»* — усеагульнае апалчэнне, у аснове якога было шляхецкае апалчэнне. Такі род войск з'яўляўся асноўнай формай арганізацыі ўзброеных сіл дзяржавы, заснаваны на прынцыпе, што кожны шляхціц незалежна ад велічыні маёнтка ў час вайны павінен адпраўляцца ў ваенны паход [5, с. 429]. За ваенную службу ён мог атрымаць зямельны надзел як у часовае ўладанне, так і ў спадчыну. Колькасць рэкрутаў, якіх павінен быў выстаўляць феадал ад свайго маёнтка, залежыла ад памераў яго зямельнага надзелу і колькасці сялян. Феадалы, у якіх не было ўласных сялян, павінны былі самі выконваць ваенныя абавязкі. Але такая форма мабілізацыі



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version





**Шалом XIV—XV стст.**



**Адкрыты бацынет**



**Прылбіца «песіная пыса»**

з цягам часу аказалася малапрадуктыўнай, а больш эфектыўнай мерай было запрашэнне наймітаў, вопытных прафесіяналаў, якія якасна выконвалі ваенныя абавязкі.

Арганізацыя і структура войска вельмі падрабязна апісваюцца ў працы Ю. М. Бохана «Наёмнае войска ў Вялікім Княстве Літоўскім. XV—XVI стст.». Структурнай адзінкай прафесійнага войска ВКЛ з'яўлялася *харугва*, якая выступала пад асобным сцягам і ў час бою шыхтавалася глыбокай, звужанай наперадзе калонай — *клінам*. «Галаву» кліна складалі цяжкаўзброеныя рыцары, забяспечаныя найбольш вынослівымі коньмі, максімальна поўным засцерагальным узбраеннем і дрэўкавай зброяй — *капійнікамі*. За імі размяшчаліся больш лёгкія *стральцы*, асноўны баявы рыштунак якіх складала зброя далёкага бою — лук ці, найчасцей, арбалет. Капійнікі праломвалі непрыяцельскія шыхты пад прыкрыццём стральцоў, якія вялі агонь паўзверх галоў пярэдніх ліній. Пасля гэтага бітва распадалася на асобныя паядынкі з прымяненнем зброі блізкага бою.

Найдрабнейшай арганізацыйнай адзінкай, якая і вызначала характар баявой пабудовы харугвы, з'яўлялася так званае *коп'ё*, якое мусіла складацца з аднаго капійніка, што выступаў у ролі даводцы атрада, і некалькіх, у ідэале двух, стральцоў [3, с. 22].

З тэксту школьнага падручніка вынікае, што тэхналогіі ўзбраення войска ВКЛ былі выкліканы як заходнееўрапейскімі, так і ўсходнееўрапейскімі навацыямі. Асноўнымі адзінкамі ўзбраення з'яўляліся: *шчыт, меч, корд, тапор, баявы молат, булава, шлем (шалом, бацынет, прылбіца), даспехі*.

Для фарміравання ўстойлівых гістарычных ведаў вучняў неабходна зрабіць акцэнт на інтэрпрэтацыю складаных тэарэтычных паняццяў, якія выклікаюць цяжкасці ў сваім разуменні. Тэрмін «зброя» — гэта сукупнасць матэрыяльных сродкаў, прызначаных для вядзення бою, забеспячэння паражэння праціўніка і магчымасці абароны ад паражэння ворагам. Падзяляецца на *засцерагальнае* і *наступальнае* ўзбраенне (бліжняга і далёкага бою) [4, с. 371].

**Засцерагальнае ўзбраенне.** Найбольш папулярнай адзінкай зброі ў Вялікім Княстве Літоўскім да сярэдзіны XVI ст. былі шлемы (шаломы, бацынеты, прылбіцы). *Шаломы* існавалі са старажытнарускіх часоў і былі папулярныя да XVI ст., пасля чаго яны саступілі месца больш дасканалым шлемам *бацынетам*. Істотнай асаблівасцю гэтых шлемаў было тое, што яны мелі падоўжаныя з бакоў і ззаду краі, якія баранілі вушы і шыю. У XIV ст. пачынаюць распаўсюджвацца *прылбіцы*. Наперадзе была рухомая частка, якая абараняла твар.

Значнай папулярнасцю ў ВКЛ, асабліва да канца XV ст., карысталіся даспехі, набраныя з невялікіх металічных пласцінак (*пласцінкавыя даспехі*). Пласцінкі маглі злучацца паміж сабой рэмянчыкамі, а ў больш дасканалых варыянтах яны мацаваліся да скураной або тэкстыльнай асновы. Распаўсюджванне даспехаў, як і іншых відаў зброі, знаходзілася пад уплывам як усходнееўрапейскіх, так і заходніх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version





**Корды**



**Наканечнікі**



**Арбалет**

наваций. Таксама ў часы Сярэднявечча адной з самых папулярных форм аховы цела былі даспехі, сплеценыя з невялікіх металічных кольцаў, больш вядомыя як *кальчуга*. Пэўную канкурэнцыю кальчузе як прадстаўніку эластычных даспехаў складалі *неметалічныя даспехі*, якія рабіліся са скуры або некалькіх слаёў шчыльнай тканіны, перакладзеных ватай.

Важным элементам засцерагальнага ўзбраення з'яўляліся *шчыты*. З пашырэннем пласцінкавага даспеха сфера іх ужытку звузілася, а папулярнасць тлумачыцца магчымасцю іх выкарыстання ў баях бліжняга бою.

**Наступальнае ўзбраенне.** *Зброя бліжняга бою* складала аснову індывідуальнага вайсковага рыштунку. Яна падзяляецца на *клінковую*, *дрэўкавую* і *абуховую*. Клінковая зброя ў другой палове XIV — канцы XVI ст. выступае як адзін з больш папулярных відаў узбраення. Вялікую групу складаюць мячы, але гэта не самы масавы від зброі, таму што кошт яе быў высокі. Паралельна з мячамі выкарыстоўваліся *корды* і цесакі, якія належалі да аднялязовай клінковай зброі.

Да аднаго з найбольш старажытных відаў зброі належыць *абуховая зброя*, распаўсюджаная яшчэ ў першабытным грамадстве (булава, молат і інш.).

Яшчэ адзін архаічны від — *дрэўкавая зброя*, разнавіднасць ручной халоднай зброі. Яна характарызуецца наяўнасцю доўгай рукаяці, на якой трывала і нерухома замацавана баявая частка.

*Кідальная зброя* — адзін з найстаражытнейшых тыпаў зброі, разлічаный на паражэнне праціўніка на значнай адлегласці (*лук і стрэлы*). Папулярнасцю карыстаўся і арбалет — механізаваны лук.

Вывучэнне пытанняў арганізацыі і ўзбраення войска ВКЛ у XIII—XVстст. дае вучням уяўленне пра магчымасці абараназдольнасці дзяржавы ў часы Сярэднявечча. Выкарыстанне гэтых матэрыялаў на ўроках гісторыі ў сярэдняй школе дазволіць пашырыць гістарычны светапогляд і пазнавальную цікавасць школьнікаў да ўрокаў гісторыі. Комплексны агляд прапанаванай праблемы дазваляе пераадолець цяжкасці ў інтэрпрэтацыі тэм школьнага падручніка, якія ў асобных выпадках вынікаюць з фрагментарнасці яго зместу.

Практычныя рознаўзроўневыя заданні

***I узровень***

Суаднясіце паняцці.

*1-ы варыянт*

| | |
|---|---|
| Паспалітае рушэнне | Арганізацыйная адзінка |
| Харугва | Баявы парадак войска |
| Клін | Апалчэнне |

*2-і варыянт*

| | |
|---|---|
| Дрэўкавая зброя | Арбалет |
| Кідальная зброя | Булава |
| Абуховая зброя | Кап'ё |



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



***II узровень***

Ахарактарызуйце паняцце.

*1-ы варыянт*

Пагоня — гэта... .
Клінковая зброя — гэта... .

*2-і варыянт*

Харугва — гэта... .
Засцерагальнае ўзбраенне — гэта... .

***III узровень***

Вызначце ўзаемасувязь паміж паняццямі.

*1-ы варыянт*

Паспалітае рушэнне ↔ пагоня.

*2-ы варыянт*

Харугва ↔ кап'ё.

***IV узровень***

Выкажыце ўласныя меркаванні.

*1-ы варыянт*

Чым, на ваш погляд, быў выкліканы пераход ад усеагульнай мабілізацыі да шляхецкага апалчэння?

*2-і варыянт*

Чаму, на ваш погляд, больш эфектыўным было запрашаць у войска ВКЛ наймітаў?

***V узровень***

Дайце гістарычную ацэнку, свой адказ абгрунтуйце.

*1-ы варыянт*

Як вы лічыце, ці можна казаць аб тым, што ВКЛ мела магутнае войска?

*2-і варыянт*

Як вы лічыце, ці можна казаць аб тым, што войска ВКЛ развівалася толькі пад уплывам усходніх і заходніх навацый і чаму?

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. *Бохан, Ю. Н.* История Беларуси с древнейших времён до конца XV в.: учеб.пособие для 6 кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения : в 2 ч. / Ю. Н. Бохан, С. Н. Темушев; под ред. Ю. Н. Бохана. — Минск : ИД БГУ, 2016. — Ч. 2. — 146 с.
2. *Бохан, Ю. М.* Зброя Вялікага Княства Літоўскага (1385—1576) / Ю. М. Бохан. — Мінск. 2003. — 88 с.
3. *Бохан, Ю. М.* Наёмнае войска ў Вялікім Княстве Літоўскім. XV—XVI стст. / Ю. М. Бохан. — Мінск, 2004. — 92 с.
4. *Плавінскі, М. А.* Зброя / М. А. Плавінскі // Археалогія Беларусі : энцыкл. : у 2 т. — Мінск, 2009. — Т. 1. — С. 371.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 1999. — Т. 5. — 592 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version